## Пытанні жыллёвага сектара іэнергасбережения мясцовых стратэгіяхустойлівага развіцця



На пачатак 2013 года ў Беларусі распрацавана і надрукавана больш за 20 мясцовых стратэгій устойлівага развіцця ("Масцовых павестак-21") ці іх канцэпцый. Іх ажыццяўленне павінна садзейнічаць інтэграцыі прынцыпаў устойлівага развіцця ў планы і мерапрыемствы гарадоў і раёнаў, пашырэнню ўдзелу насельніцтва ў прыняцці і рэалізацыі дзеянняў у рэчышчы мясцовага развіцця і, як вынік, прывесці да павышэння эфектыўнасці рэгіянальнай і мясцовай палітыкі. Адна з важных функцый мясцовых стратэгій устойлівага развіцця – рэалізацыя палажэнняў "Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года". Жыллёва-камунальная тэматыка, а таксама пытанні энергазберажэння, энергаэфектыўнасці і выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі, як правіла, не пазбеглі ўвагі распрацоўшчыкаў мясцовых стратэгій устойлівага развіцця. Разам з тым ёсць неабходнасць ў больш глыбокай распрацоўцы гэтай тэмы ў многіх Мясцовых павестках-21. Актуальным з'яўляецца таксама абмен вопытам ў дадзенай сферы і распаўсюджванне інавацыйных падыходаў.

На вырашэнне гэтых задач скіраваны праект "Развіццё патэнцыяла ўстойлівасці жыллёвага сектара – садзейнічанне павышэнню эфектыўнасці кіравання на розных узроўнях у Рэспубліцы Беларусь", які ажыццяўляецца ў 2012 – 2014 гадах у межах праграмы Еўрапейскай камісіі "Аб'яднанні грамадзян і органы мясцовага самакіравання: партнерства на карысць развіцця". Праект часткова фінансуецца Еўрапейскім Звязам. Вядучым партнерам праекта ў Беларусі з'яўляецца Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Экапраект", а ў Нямеччыне – Ініцыятыва "Жыллёвая гаспадарка ва Ўсходняй Еўропе" (Берлін). У межах дадзенага праекта вывучаны досвед гарадоў Усходняй Германіі па пераўтварэнню жыллёвага асяроддзя і распрацаваны рэкамендацыі па выкарыстанню гэтага досведу ў Рэспубліцы Беларусь. У ліку напрамкаў развіцця жыллёва-камунальнага сектара, якія станоўча зарэкамендавалі сябе ў нямецкіх гарадах, можна адзначыць наступныя:

• Працаваць на падмурку стратэгій;

• Дзеля кожнага мікрараёна распрацоўваць сваё бачанне (вобраз жаданай будучыні);

• Зберагаць гісторыю (гістарычныя будынкі, планіроўку) і абапірацца на традыцыі;

• Актыўна выкарыстоўваць інвацыі (напрыклад, аднаўляльныя крыніцы энергіі);

• Уцягванне насельніцтва – залог поспеху ("Трэба адразу далучаць насельніцтва!");

• Ствараць тэматычныя працоўныя групы, куды актыўна запрашаць экспертаў;

• Забяспечваць міждысцыплінарны падыход у стратэгічным развіцці (збіраць па 15-20 розных экспертаў, залучаць моладзь, мясцовы бізнес);

• Прарэджванне забудовы (знос неэфектыўных панэльных дамоў) і будаўніцтва на вызваленых тэрыторыях дзіцячых пляцовак, стаянак, сквераў;

• Ператварэнне тыпавых пяціпавярховак ў «таун-хаўсы» з кватэрамі з асобнымі ўваходамі з двара, прыбудова пласторных балконаў, абсталяванне дамоў ліфтамі, стварэнне інфраструктуры для ровараў.

*Сіваграка́ў А.Ў., Міжнародны дзяржаўны экалагічны універсітэт імя А. Сахарава, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*